Беларускі Звон

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9). Рэдакцыя адчынена: 12—2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Рукапісы павінны быць напісаны чытальна і толькі на адным баку паперы, з праўдзівым прозьвішчам аутара і адрэсам для ведама Рэдакцыі. Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана кожнага нумару 50 м. Падпіска на 3 месяцы каштуе 600 м. (з дост. да хаты). Цана абвестак: перад тэкстам 200 мк., сярод тэксту 300 мк. і на апошняй страніцы 120 мк. за радок пэтыту у 1 шпальт.

Год II. Вільня, Пятніца, 8-га верасьня 1922 г. № 18 (43).

Да самаупраўленьня.

Апошнімі часамі адбываліся па валасьцёх выбары ў валасныя (гмінныя) рады.

Гэта — першы крок да праведзеньня самаўпраўленьня на Беларускіх землях Польшчы, — тых землях, дзе дагэтуль панавала безразьдзельна самавольства польскага панства і адміністрацыі, набіранае пераважна з людзей нам чужых, незнаёмых з нашым краем, але затое вельмі руплых аб сваю ўласную кішэнь...

Выбары гэныя, як і ўсялякія выбары ў нашым бяздольным краю наагул, адбываліся ў варунках, далёкіх ад тое свабоды, якую маюць аратары „Вызваленьня" і аб якой так шумна пішацца ў польскай конституцыі. Ды мы, пішучы для вёскі, ня маем патрэбы асабліва затрымлівацца на гэтым: вёска лепш, чым хто ведае, якая ў нас пануе „паліцэйская свабода", — нашы-ж чытачы з места бачылі адбіцьцё жыцьця нашае вёскі ў тых налічаных карэспандэнцыях, у якіх апісываюцца гвалты паноў і адміністрацыі над народам.

І вось, ня гледзячы на „паліцэйскую свабоду", ня гледзячы на крэпкую хаўрузію паміж панам-абшарнікам, жандарам і ксяндзом-палякам, якія баламуцілі нашых сялян і падкупам, і пагрозамі кар на гэтым і на тым сьвеце, — выбары шмат дзе прайшлі вельмі няўдачна для польскага панства. Воласьць за воласьцю скідалі з сябе ярмо чорнае хаўрузіі і выбіралі у гмінныя рады бадай выключна сялян—сьвядомых беларусаў. У іншых валасьцёх выбарная барацьба з панскімі сьпіскамі кандыдатаў вялася адкрыта пад беларускім нацыянальным штандарам. Гэтак, прыкладам, у Радашкоўскай воласьці падпанкі-палякі імкнуліся апанаваць гмінную раду з тым, каб ні за што не дапусьціць перадачы дому б. пачатковаэ школы пад беларускую гімназію ў Радашковічах. Наадварот, усе сяляне жадалі адкрыцьця гэтае гімназіі,—і на выбарах панскія сьпіскі праваліліся.

На гэтых выбарах вельмі ярка выявіўся узрост нацыянальнае і грамадзкае сьвядомасьці ў нашых сялян. Выявілася, што наш народ дасьпеў да таго, каб браць сваю грамадзкую гаспадарку ў свае рукі,— выявілася, што чужацкія „апякуны" нам зусім не патрэбны.

Але гмінныя рады абнімаюць толькі зусім абмяжованы круг спраў воласьці. Каб узяць у свае рукі ўсё жыцьцё нашае краіны, мала выкурыць чорную хаўрузію з воласьці. Дзеля гэтага трэба завясьці самаупраўленьня таксама і ў павеце, а тады ўсе беларускія паветы павінны быць аб'яднаны ў аўтаномную краёвую арганізацыю, у якой усе справы разьвязываў-бы наш краёвы сойм у Вільні. Толькі тады наш народ здолее хоць у нейкай абмяжованай меры навет і пад польскаю ўладаю зьдзейсьніць сваё права, быць гаспадаром на роднай зямлі.

Мы ведаем, што польская ўлада, польскі сойм самахоць на гэта ня пойдуць, не зракуцца тых уплываў, якія робіць у нас цяпер чорная хаўрузія. Як некалісь маскалі, так цяпер палякі думаюць, што дзяржава іх будзе дужая не тады, калі ўсім народам у ёй будзе добра жыць, а тады, калі польскі жалезны кулак будзе крэпка дзяржаць за горла ўсіх „інародцаў". Дык якжа нам дайсьці свайго?

Дзеля гэтага, ідучы конституцыйнай дарогай — дарогай права і закону, ёсьць толькі адна рада. Мы, беларусы, павінны чым больш месц здабыць для сябе ў польскім Сойме. Мы, папаўшы ў сойм, павінны крэпка схаўрусавацца з другімі нацыянальнасьцямі Польшчы, павінны падаць руку лепшым прадстаўнікам польскае дэмократыі і дружным націскам разьбіць тыя путы, ў якія і нас, і другія народы закавала і хоча далей дзяржаць усё тая-ж усясільная дагэтуль чорная хаўрузія з польскім панам на чале.

М. Малішэўскі.

Асноўныя тэзісы плятформы Беларускага Цантральнага Выбарнага Камітэту, прынятыя на Конфэрэнцыі ў Вільні 9-10 жніўня 1922 г.

1) **Абарона правоў Беларускага насяленьня.** Задэкляраваныя Конституцыяй правы нацыянальных меншасьцяў павінны быць праведзены адносна да беларусаў у-ва ўсё правадаўствы і ў адміністрацыйную практыку.

Дзеля забясьпечаньня апошняга ў межах Беларускае тэрыторыі беларусы павінны быць дапушчаны бяз ніякіх агранічэньняў на адміністрацыйныя ўрады ўсіх інстанцый.

Свабода нацыянальнае беларускае школы ўсіх ступеняў, утрыманьне на кошт скарбу.

Роўныя правы для беларускай мовы з урадовай мовай у адміністрацыі і судзе.

Поўная свабода грамадзкае і эканамічнае арганізацыі, свабода сходаў, слова і друку.

2) **Поўная салідарнасьць усіх нацыянальных меншасьцяў у абароне правоў усіх іх разам і кожнае асобна.**

Паразуменьне з польскай дэмократыяй на грунце абароны права, поступу і эканамічных інтарэсаў працоўнага народу.

Барацьба з усімі праявамі адміністрацыйнага гвалту.

3) **Поўная свабода для ўсіх рэлігій.** Абарона кожнага вызнаньня ад уціску улады. Барацьба з урадовай палітыкай, якая імкнецца падзяліць на два варожыя абозы напалову каталіцкае, напалову праваслаўнае беларускае насяленьне дарогай фаворызацыі аднаго і уціскаьня другога вызнаньня.

4) **Хутчэйшае правядзеньне ў жыцьцё зямельнае рэформы.** На Беларускай тэрыторыі—уся зямля **Беларускаму працоўнаму народу!** Зямельная рэформа ня можа служыць мэтам польскае колонізацыі на Беларускіх абшарах. Пры раздзеле дворных зямель між тутэйшымі сялянамі цяжар зямельнае рэформы ня можа быць узложаны выключна на ўласьнікаўнепалякаў.

Землі ўцякачоў, дагэтуль не вярнуўшыхся з Расеі, ні ў якім прыпадку не падлягаюць конфіскацыі.

Пакуль ня будзе праведзена ў жыцьцё зямельная рэформа, — абарона дробных арандароў ад усялякіх гвалтаў з боку двароў і адміністрацыі.

Абарона беларускіх лясоў ад аднабочнае і рабункoвае гаспадаркі ураду. Хутчэйшае правядзеньне ў жыцьцё нацыяналізацыі лясоў.

5) **Работніцкае пытаньне.** 8-гадзінны рабочы дзень.

Поўная свабода работніцкае арганізацыі дзеля барацьбы за ідэалы рабочага народу.

Абавязак улады забясьпечыць права на працу кожнаму работніку.

Самая шырокая дзяржаўная падмога работнікам дзеля разьвіцьця прасьветы і прафэсыянальнага узгадаваньня. Дзяржаўнае забясьпечаньне на прыпадак хваробы, старасьці, інваліднасьці і безработцьця.

6) **Грамадзкая арганізацыя.** Чым хутчэйшае правядзеньне ў жыцьцё на ўсіх Беларускіх абшарах валаснога і павятовага самаўпраўленьня з забясьпечаньнем праўдзівае свабоды выбараў у валасныя і павятовыя самаўрады.

Выдзяленьне беларускіх часьцін з польскіх ваяводзтваў, куды явы далучаны дзеля поланізатарскіх мэтаў.

Утварэньне з усіх Беларускіх абшараў асобнае аўтономнае адзінкі з краёвым соймам у Вільні.

7) **Тэрыторыяльная арганізацыя арміі.**

8) **Запраўдная дзяржаўная помач рээмігрантам-беларусам,** байкатаваным цяпер урадам.

9) Барацьба проці фаворызацыі урадам этнографічна польскага цэнтру коштам няпольскіх „акраін".

10) Абарона кватарантаў ад эксплуатацыі камянічнікамі.

11. Помач рээмігрантам. Адбудова ўрадам ўсіх зруйнаваных вайной гаспадарак. Зварот на кошт скарбу ўсяго жывога і мёртвага інвэнтару.

† Марыя Кімонтовая.

Гэткі невялікі ў нас гурток працаўнікоў над разьвіцьцём беларускага мастацтва, — а і тут лютая сьмерць вырывае лепшыя адзінкі.

Мы стаім перад сьвежаю магілай выдатнае музыкантшы, добра вядомай у артыстычных кругах Вільні — дый не аднэй тольні Вільні — піяністкі Марыі з Ячыноўскіх Кімонтовай.

Усё жыцьцё сваё яна пераважна правяла за межамі нашага краю. Вучылася ў пецярбурскай Консэрваторыі ў вялікага Рубінштейна. Пасьля, выйшаўшы замуж за літоўскага грамадзкага дзеяча, Янкі Кімонта, жыла ў Пскове, Казані і другіх мястах Расеі.

Але ўсёй душой ірвалася на Бацькаўшчыну. І пад канец жыцьця глятуценьня яе зьдзейсьніліся: яна з мужам асела ў гэтак любай ей Вільні.

Тут сустрэлася з беларускім адраджэнскім рухам пазнаёмілася з беларускімі дзеячамі. І старая беларуская кроў уніяцкае папоўскае сям'і Ячыноўскіх разам у ёй загаварыла.

Яна горача адгукнулася на кліч да працы над разьвіцьцём беларускае музыкі. Гармонізовала песьні для беларускага хору, сама кіравала нейкі час гэтым хорам, давала канцэрты на карысьць беларускіх установаў.

Працу гэту завяршыла цэлым композытарскім творам — улажэньнем орыгінальнае музыкі да «Залётаў» Дуніна Марцінкевіча. Пад яе-ж кіраўніцтвам была першы раз пастаўлена гэта пьеса ў Вільні ў 1914 годзе.

Дый, паміма працы на свае спэцыяльнасьці, горача прыймала да сэрца ўсе беларускія справы, а ў доме Кімонтаў, дзе панаваў дух вялікіх традыцый

ГРАМАДЗЯНЕ! Аб кожным нарушэньні адміністрацыяй свабоды выбарнае агітацыі, аб кожным арышце за перадвыбарную агітацыю, аб нявыдачы дакумэнтаў і другіх нарушэньнях закону ураз-жа паведамляйце на пісьме Беларускі Цэнтральны Выбарны Камітэт у Вільні (Віленская вуліца дом № 12, кв. 6), або свой беларускі павятовы ці акружны камітэт—найлепш не праз почту, а праз пасланца.

Грамадзяне! Пільнуйце, каб вас упісавалі ў сьпіскі выбаршчыкаў!

волі, роўнасьці і брацтва народаў, беларусы бывалі частымі госьцямі.

Апошнія гады жыцьця Марыі Кімонтовай былі дужа цяжнія. Галадоўка ў часе нямецкае акупацыі, бязупынныя зьмены ўлады, рэзкія пераходы ад мамэнтаў вялікае радасьці ад здзейсьненьня ідэі незалежнасьці нашага краю да цяжкое няволі — усё гэта востра адбівалася на вельмі чулай душы артысткі і яе нэрвах.

І нэрвы ня вытрымалі. Душа захварэла.

Ад пачатку гэтага году яна ўсьцяж была хворая, і мала хто з прыяцеляў бачыў яе. Дый памерла яна неяк ціха: бадай ніхто з беларусаў ня ведаў аб яе сьмерці, бадай ніхто не пайшоў аддаць ей апошні паклон на вечнае разьвітаньне.

За тое, калі спозьненая вестка дайшла да тых, хто гэтулькі гадоў так часта сустракаўся з нябожчыцай і пры рабоце, і ў гадзінах адпачынку, — шчыры жаль сьціснуў сэрца беларусаў.

Беларускае грамадзянства ўвекавечыць імя Марыі Кімонтовай, як яна на гэта сваей дзейнасьцю заслужыла. А пакуль-што мы хоць гэтымі радкамі памянем яе.

Хай родная зямелька будзе ей пухам.

А. Навіна.

Перад выбарамі.

Выбарная акцыя ў Навагрудзкім акругу.

Арганізаваныя ўжо раней у Навагрудку і Баранавічах беларускія выбарныя камітэты цяпер добра працуюць, пашыраючы працу навокала гэтых пунктаў. Гэтымі днямі залажыліся беларускія выбарны павятовыя камітэты ў Слоніме і Несьвіжу і на днях будзе заложаны ў Стоўпцах. Насяленьне паўсюды вельмі зацікаўлена выбарамі і толькі чакае, каб прыехалі скарэй агітатары ад беларусаў, бо выступаючыя на кірмашах агітатары ад польскіх партыяў „Вызваленьне" і „Людоўцы" ўжо абрыдлі сваімі крыклівымі дэмагогічнымі прамовамі і ім ніхто няверыць, хоць яны і суляць нашаму селяніну залатыя горы.

Сялянства нашае і наша інтэлігэнцыя ў працягу апошніх гадоў настолькі былі прыдушаны ўсялякімі несправядлівасьцямі мясцовых уладаў, што з пачатку пайшло было за польскімі левымі партыямі, суліўшымі скорае збаўленьне ад усялякіх бедаў.

Аднак, пад уплывам ужо распачатай і беларусамі выбарнай агітацыі, сялянства даведалася, што ўсе гэтыя пекныя прамовы «Вызваленцаў» і «Людоўцаў» аб панскай зямлі, якую яны на словах задарма аддаюць нашаму сялянству,—адно ашуканства, бо тое-ж самае „Вызваленьне" галасавала у Варшаўскім Сойме за „осадніцтва" польскіх жаўнераў на нашых землях і тым самым даказала на дзеле, як яно разумее і вырашае зямельнае пытаньне.

Цяпер наша сялянства хоць і слухае падчас вызваленскага дэмагогабрахуна, але без ахвоты, знаючы, што гэтым панам фактычна ходзіць аб тым, каб ад нашых беларускіх зямель прайшоў у Польскі Соймне беларус, а паляк. А так як да нашага селяніна можна прыступіцца толькі з праграмаю, адпаведаючаю яго інтарэсам, дык „Вызваленьне" і пайшло з пекнаю выбарнаю праграмаю, якую надрукавала навет на беларускай мове, каб нашае сялянства не разабралася, якая гэта партыя — польская ці беларуская. Але вось скора стала ведама, што праграма „Вызваленьня" на польскай мове моцна адрожніваецца ад праграмы на беларускай мове; што ў беларускай праграме вызваленцаў многія пытаньні вырашаюцца зусім іначай, як у польскай. Стала ясным, што „Вызваленцы", каб здабыць сабе мандаты ад беларускага сялянства, пайшлі на палітычнае шулерства, ашуківаючы тым самым наш народ.

Дзіўна яшчэ адно, што ўлада церпіць дэмагогічныя выступленьні вызваленцаў, тады як самыя нявінныя праявы перадвыбарнай акцыі беларусамі караюцца самым беззаконным парадкам. Відаць, што вышэйшым уладам ходзіць аб тое, каб ад „крэсаў ўсходніх" прайшлі ў Сойм хоць і крыкуны-дэмагогі „Вызваленцы" (самы палякі называюць іх „паліраванымі бальшавікамі"], абы не беларусы, бо тады ўсім стане ясным, што на „крэсах ўсходніх" жывуць беларусы.

Усё гэта мы, навагрудзкія беларусы, добра разумеем і ідзём на выбары за Цэнтральным Выбарным Беларускім Камітэтам у Вільні.

М. С.

Беларускія Выбарныя Камітэты.

У м. Рудоміне (7 вер. ад Вільні) закладзены Белар. Выбарны Камітэт, які абнімае тры гміны: Рудомінскую Салечнічыцкую і Тургельскую.

У прэзыдыум увaходзяць: гр. гр. Такароў, Ількевіч Ян, Кольнер Ал, Ількевіч Міх., Арцішэўскі Ф.

У г. Лідзе закладзены Акружны Беларускі Выбарны Камітэт. (Легіоновая вул. № 1). Старшыня прэзыдыуму гр. Міхал Васілеўскі.

У г. Ваўкавыску закладзены Акружны Белар. Выб. К—т. (Пясковая вул.) на Беластоцкі Акруг. Старшыня прэзыдыуму гр. Каліноўскі.

У г. Бельску закладзены Белар. Выбарны Камітэт (Літоўская вул.) на Цешынскі акруг. Старшыня гр. Федаровіч П.

У і. г. Аўгустове, Сакольцы і Сэйнах закладзены павятовыя Беларускія Выбарныя Камітэты.

Зая'ва аб далучэньні да Бел. Цант. Выбр. К-ту.

85 жыхароў Язьненскай гм. падалі заяву ў Белар. Цант. Выбарны Камітэт аб іх далучэньні да К-ту.

Выбарны календар.

„Dziennik Ustaw" у № 66 з 18 жніўня падаў абмылковыя даты выбарных чыннасьцей, што можа блага адбіцца на тых, хто будзе апірацца на даных урадовае газэты. «Gaz. War.» папраўляе гэтыя абмылкі. Мы і даем тут галоўныя даты, ўжо папраўленыя:

Падача дзяржаўных сьпіскаў кандыдатаў (listy państwowe) — да 26 верасьня.

Апошні дзень падачы заяваў у абводавыя выбарныя камісіі аб пропусках ці няправільных запісах выбаршчыкаў—29 верасьня.

Падача кандыдатамі з дзяржаўных сьпіскаў заяваў аб згодзе іх на выстаўленьне іх кандыдатур — на 4 кастрычніка.

Падача акружных сьпіскаў кандыдатаў—да 6 кастрычніка.

Заявы паўнамоцных выбаршчыкаў аб далучэньні акружных сьпіскаў да дзяржаўных—да 14 кастрычніка.

Напраўка.

У № 17 „Бел. Звону" у ст. „Абводавыя Камісіі" ёсьць друкарская абмылка. Надрукавана: „кожны выбаршчык уносіцца ў сьпісак да таго абводу, ў якім жыў да 17 жніўня г. г.", а трэба: „у сьпіскі таго абвода ў якім жыў у дзень 17 жніўня г. г.". Гэтая вялікая розніца, бо выбаршчык можа жыць толькі адзін дзень 17 жніўня і мае права галасаваць. Вось пры выбарах ў Сэнат патрэбуецца, каб выбаршчык жыў у абводзе ня меньш, як адзін год да 18 жніўня г. г.

Аб выхадзе з Б. Ц. В. К-ту грам. У. Самойлы.

Прадстаўнік ад расейскае меншасьці ў Б.Ц.В.К., грам. У. Самойло, паведаміў прэзыдыум Камітэту, што ён прыняў мандат ад расейскага грамадзянства, спадзяючыся, што нявыразнае праўнае палажэньне яго адносна да выбараў выясьніцца ў тым значэньні, што ён як сталы жыхар Беларусі і ад 4 гадоў жы-

Як Лявон Недарада дарадзіў сваей бядзе.

Строгі быў загад у гміне, каб усе неадкладна плацілі „даніну„. Падышоў ўжо апошні тэрмін, але з сялян бадай ніхто не плаціў: той ня мае чым, той мае, але ня рупіцца, бо чаму іншыя ня плацяць, а той, кіруючыся усякімі асабістымі перакананьнямі, зусім ня хоча плаціць. І так „даніна" ані з мейсца.

Ажно прыехаў якісь важны чын у гміну. Сабраў сход і ў прысутнасьці жандараў нагрымеў страшных слоў, даў тэрміну толькі тры дні, прыгразіў астрогамі, настукаў кулакамі, лаіўся — надта ўжо відаць яму гэтая „даніна" патрэбна была. Як ачумеўшыя разыходзіліся сяляне са сходкі: — ціхія, панурыя, з затаёнными думкамі, ось быццам той лес, што чакае буру — навальніцу.

А Лявон Недарада дык ма быць больш за усіх меў клопату. Яму ўсё жыцьцё ніяк ня ручыла, а ў грашовых справах — асабліва. І спраў гэтых у яго заўсёгды было гібель, а грошы дык ніколі ня было. Узяцьбы хоць цёшчу Лявона, памерла і не сказала, дзе грошы схавала: не здалела сказаць — раптоўна памерла. А сама калісь хвалілася, што прызапасіла на чорную гадзіну; навет неякім прыпадкам чырвонец захаваўся. Лявон сам яго бачыў, пробаваў зубамі, стаўляў рубцом ці не фальшывы. Ня мала клопату ён меў і са сваей жонкай. Баба была хоць куды: спор мела ў руках і дагляд гаспадарскі; адзін толькі быў фэлер: цераз меру была прыгожа. Кожны на яе галіўся, падлабуніваўся усялякімі спосабамі і гэтым набівалі ёй цану; пачала яна ганарыцца, узяла Лявона, як кажуць, на паводок і ня мог Лявон ёй нярэчыць, бо не устаяць яму супроць яе красы. Вось і цяпер прадаў-бы ён Серадулю і адпіхнуў-бы сваю бяду — „даніну", а там Бог — бацька. Але не туды тое, зрабіць гэтак не удасца, бо жонка не дазволе; ды яно і справядліва, што варта гаспадыня без каровы ці карова без гаспадыні. Апрыч таго жонка апошнімі часамі нешта стала бокам хадзіць, трэба неякім гасьцінцам паддобрыцца, Бяда з гэтымі прыгожымі жонкамі! А тут і вясна на дварэ, хлеба няма, нарогі трэба купіць...

І усяго тэрміну тры дні! І яму Лявону, звычайнаму сабе бульбаеду, трэба столькі грошы выдаўбаць недзе, прыдумаць неякі ратунак.

Так разважаў Лявон ідучы са сходкі. Усю здатнасьць сваю ён ужыў, каб прыдумаць, дарадзіць сваей бядзе. Але як? Хіба-ж ён бачыў калі радасны прамень у сваім жыцьці? Хіба-ж ня ён сын падняволенага народу? Хіба-ж ня шоў дождж і не разліўся пансак у печцы, калі ён радзіўся? А барадаўка на носе хіба не магнэс для ўсялякіх напасьцяў. Эх, з горам радзіўся, з горам мабыць прыдзецца памерці! Дык вось чаму яго загартаваныя працай рукі сталі непаслухмянымі і так нялоўка аціралі халодны пот з чала.

Прышоўшы дамоў зьмерканьнем, Лявон з нікім з хатніх ня ўваходзіў у гутарку і не вячэраўшы лёг спаць. Дакучлівыя, трывожныя думкі не пакідалі яго ўсю ноч.

Са змучанай душоў устаў ён з першым пеўням і пашоў на даржнік, каб дагледзіць гаўяда, і тут яму прышла шчасьлівая думка.

У бальшавіцкія часы, калі аднасельчане разьбівалі панскі двор, Лявон, не умешываючыся ў разбушаваную табалу, пашоў пацікавіцца гэтым надзвычайным выпадкам. Увышоўшы ў панскі сад, ён згледзіў невялічкую бліскучую шмаціну з квяцістымі камечыкамі. Падняўшы яе, пашоў дамоў і ня ведаў, што з ёй зрабіць. Разгледаючы аднаго разу знахадку Лявон заўважыў на ёй чырвонавую пляму і зразу дагадаўся, што гэта была кроў. Аж неяк занудзіла яго, апанаваў забабонны жах, і, каб далей быць ад грэху, бардзей абярнуў шмаціну ў рызман, улажыў у каробку ад калёснай мазі і закапаў у восеці. Хутка Лявон пераканаўся, што як толькі пачне думаць аб сваей знахадцы, дык неякае ліха з ім здарыцца: то конь пад ім спатыкнецца, і ён зваліцца ў гразь, то на прыпол выпусьціць лыжку са стравай, то цьвек назаве гузікам, адным словам Лявон прыкмеціў ўва ўсім гэтым чартоўскую махінацыю.

Вось чаму ён так узрадаваўся, калі успомніў знахадку: сягоньня кірмашовы дзень, пойдзе ў мястэчка і прадась там каму з пад палы — і бяды пазбудзіцца і грошы будзе мець, хоць грошы, што праўда, ня чыстыя, але на „даніну" самыя тыя.

Нікому ня кажучы, адкапаў ён знахадку і пашоў на кірмаш. Увашоўшы у бор, зьняў шапку і ідучы пачаў маліць Бога, — каб яму ды хоць раз у жыцьці пашанцавала. Калі добра усё ўдасца, абяцаў Богу трэцьцюю часьць выручаных грошы, але пасьля доўгай развагі над пакутным жыцьцём-быцьцём зрабіў моцную пастанову ахвяраваць толькі пятую часьць.

Прышоўшы ў мястэчка, Лявон пацягаўся па рынку прыглядаючыся да людзей, якія больш падыходзілі да яго справы. Знаёмых жыдкоў ён не хацеў чапаць, каб не асароміцца. Усё гэта яго дужа непакоіла. Ня раз моцна задумаўшыся, натыкаўся на людзей, ці, не пачуўшы крыку: „з дарогі!", будзіўся ад удару аглаблёй ў плечы. Ужо думаў уцекаць да хаты здаўшы усё на Боскую апеку, як тут перад сабой, згледзіў франтаватага паўпанка, відаць пацягнуўшага гары, бо усёківаўся ў бакі. Доўга сачыў за ім Лявон, чуў, як паўпанка звалі „амэрыканцам", і ніяк ня мог адважыцца, каб яго зачапіць.

— А што калі арыштуюць ды пачнуць біць?! падумаў Лявон. Ну але мусіць той важны чын у гміне быў страшней за страх Лявона, бо ён вытаркнуўшы рог шмаціны з кішані, падышоў да паўпанка і сказаў: „купіце!" Паўпанак абглецзіў, памармытаў і тыц два даляры ў руку Лявона. Аж у вачах Лявону пацямнела, хацеў у руку цмокнуць дабрадзею свайму, але той ужо зьнік.

Напетушыўся Лявон, жывей забілася кроў у сэрцы; важна размахіваючы рукамі, пашоў да знаёмага загатоўшчыка Лэйзара і загадаў паставіць гары, абяцаючы падвезьці козам ахапак сена. Цяпер ён меў толькі адзін клопат гэта разрахавацца з Богам. Пятую часьць ад двух даляраў ніяк не адлічых, трэба іх мяняць, а мяняць не хацеў — баяўся каб яго не ашукалі. Абменяе ён іх у каваля сваей вёскі Боруха — ён жыдок сумленны. Аднак яго абяцанка Богу, пасьля справа шмаціны з крывавай плямай, гэтыя не чаканыя даляры не давалі Лявону супакою. У чым больш асушаў чарак, тым больш адчуваў страх перад Божым гневам, а ў сваім раптоўным багацьці бачыў выкрутасы нячыстай сілы. Неякая цяжаць прыгнечала Лявона, марока плутала думкі, і радасьць, і трывога валтузіліся ў грудзях; ён чуў патрэбу зрабіць нешта надзвычайнае, балчa-вострае, каб ачуняць, пачуць яснейш што з ... і дзе ён. Вось, каб пазбавіцца ад усяго гэтага клопату, рашыў хмельнай галавой і грэшнай душой пайсьці ў касьцёл і паляжаць крыжам, а можа такім чынам ня толькі адстраша чарта, але і адпакутуе і пятую часьць ад даляраў.

На нешпарах касьцёл быў паўнюсенькі народам. Лявон зацісьнуўся пад сьцяну і бухнуў

Закладайце Беларускія Выбарныя Камітэты у кожным акругу і у кож. абводзе!

хар Вільні, будзе мець права на учасьце ў выбарах. Аднак, пераканаўшыся, што яго спадзеваньні ня будуць зьдзейсьнены, ён лічыць сваім абавязкам адмовіцца ад мандату і ад чыннага ўчасьця ў выбарах, якія, згодна з духам права, павінны быць выяўленьнем волі грамадзян-выбаршчыкаў.

Прадвыбарная „свабода“.

Аб'еднанае Бюро Блёку Нацыянальных меншасьцяў паведамляе, што адзначаны ужо выпадкі калі пошта затрымлівала карэспандэнцыю і друк, пасланую праз Бюро.

◆◆◆◆

Грамадзяне-Кватаранты!

Абвешчаныя выбары ў Сойм і Сэнат загастрылі ў першы чарод заўсёды ненасычаныя апэтыты камянічнікаў.

Новы Сойм, новыя людзі. Чаму-ж не парупіцца, каб сярод гэтых новых людзей было гэтулькі камянічнікоў, скольки трэ' галасоў, каб зьніштожыць ненавісны для іх закон аб абароне кватарантаў?!

Вось-жа і пойдуць камянічнікі на выбары дружна, адным гуртам.

Сустрэнеце іх усюды — ў кожным сьпіску кандыдатаў і ў кожнай партыі.

Няўжо-ж мы на гэта пазволім? Ды ніколі!

Грамадзяне-Кватаранты!

Нам пагражае вялікая небясьпека. Дзеля агітацыі проці закона аб кватарантах пускаюць камянічнікі ўсе свае ўплывы і вялізарныя грошы. Як з рукава, сыплюцца пратэсты камянічнікаў, рэзалюцыі, мэморыялы і газэтныя стацьці. Выбары — гэта апошняя іх атака, дый для нас найнебесьпячнейшая.

Грамадзяне-Кватаранты!

Над вашымі галовамі страха ўжо трашчыць. Глядзіце, каб яна не завалілася і ня збурыла вашых сямейных гнёздаў.

Што выйшла-бы ў прыпадку скасаваньня закону, бачыце ясна з паступкаў тых камянічнікаў, дамы каторых не падлягаюць дэкрэту. Плата за кватэру забірае львіную часьць заработку нешчасьлівых кватарантаў. З апошніх дзяруць бяз міласэрдзя.

Камянічнікі кажуць: скасуйце абарону кватарантаў, дык тады пачнем будаваць новыя дамы, і кватэраў будзе даволі.

А скольки-ж дамоў пабудавалі яны ў Вільні за міліярды, вырваныя у жыхараў, якіх не бароніць закон?

Ды ніводнага!

Пераканаными ў сваей перамозе і гордыя сваімі будучымі ўплывамі ў Сойме, яны ня йдуць ні на якія уступкі. Яны ня хочуць вясьці з намі перагавораў навет і тады, калі мы самі сулім ім павышэньне платы ў меру ўпадку валюты і ўвросту нашых заробкаў.

Яны імкнуцца да таго, каб за ўсялякую цану зьніштожыць закон проці ліхвярства—закон, які ў крытычным мамэнце бароніць нашае сьвятое права мець страху над галавой.

Грамадзяне-Кватаранты!

Хай нашым клічам будзе:

Не давайце галасоў за сьпіскі, ў якіх будуць дамаўласьнікі!

Затое галасуйце за тыя сьпіскі, кандыдаты якіх абяжуцца бараніць інтарэсы кватарантаў.

Ніводзін камянічнік не павінен папасьці ў Сойм.

Зважайце, кватаранты!

Далоў з замахам на закон аб абароне кватарантаў!

Далоў зьдзірства!

Далоў кватэрную ліхву!

Урад Саюза Кватарантаў.

◆◆◆◆

Абводавыя камісіі.

Ужо утвораны так-званыя „абводавыя выбарныя камісіі“, але сябры апошніх блага ведаюць, якія іх правы і абавязкі. Дзеля гэтага, у адказ на пытаньне некаторых спаміж іх, выясьняем:

1. Абводавыя камісіі атрымліваюць уложаныя у гмінах сьпісы выбаршчыкаў, правяраюць і зацьвярджаюць гэтыя сьпісы (арт. 34.) Яны маюць права вымагаць ад начальнікаў гмін тлумачэньняў і матарыялаў на аснове якіх тыя сьпісы укладаліся. Яны паведамляюць насяленьне гміны, гдзе і калі кожын можа пераглядзець сьпісы выбаршчыкаў.

2. Абвадовыя камісіі прынімаюць заявы аб пропусках і неправільных запісях у сьпісе выбаршчыкаў, дапаўняюць гэтыя запісі або выкідаюць няправільна ўпісаных (арт. 36 і 39).

З гэтага відаць, якое вялікае значэньне маюць абвадовыя камісіі пры укладаньні спісаў выбаршчыкаў. Але гэта ня ўсё: абводавыя камісіі праводзяць самае галасаваньне (арт. 62), прынімаючы галасы, правяраючы, ці галасуе папраўдзе тоў, хто запісаны ў сьпісе (арт. 73) і падлічаючы, за які кандыдацкі сьпісак скольки пададзена галасоў (арт. 82).

Ніякага націску на выбаршчыкаў ані агітацыі да тых ці іншых кандыдатаў абводавыя камісіі рабіць ня маюць права.

Выбарныя сьпіскі кандыдатаў, за якія павінны галасаваць беларусы і нумар іх, будуць абвешчаны Беларускім Цэнтральным Выбарным Камітэтам.

◆◆◆◆

* * *

Сыплюцца з клёнаў лісты...
Сыплюцца ціха, жахліва...
Крыюць зямлю і кусты,
Золатам крыюць маўкліва...
Сыплецца сада краса,
Кроплі дажджу, бы раса
У вецьці блішчаць без адліва.
Восень... дажджы ўжо ня дзіва.

А над зямлёю старой
Сунуцца шэрыя хмары,
Цені кідаюць парой,
Цені на пожні, папары...
Хмары плывуць і растуць,
Хмары туманы нясуць,
Што ўжо кладуцца ляніва.
Восень... туманы ня дзіва.

Сьцішыўся сумна-пусты
Шэры прастор сжатых ніваў.
Сыплюцца з клёнаў лісты;
Сыплюцца ціха, жахліва.
Сэрца таміцца, баліць —
Рвецца памерці... і жыць.
Сэрца сумуе маўкліва...
Восень... дык смутак ня дзіва.

Н. Арсеньнева.

◆◆◆◆

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Зьдзек над беларускімі сялянамі.

У першых чыслах ліпня месяца г. г. з Сувалак ў Нова-Дворскую гміну прышоў адтрад 3-га палку шволежэраў дзеля знішчэньня бандытаў. Свае заданьне атрад гэты выпаўняе, такім чынам: раз'ежджаючы па вёсках, глаўным чынам, праваслаўнага насяленьня бьюць і грабяць жыхароў, гаворачы: „wy jesteście oskarzeni“. Кім і за што, невядома. Такому нападу зьніштажаючага атрада 22 ліпня г. г. папала і вёска Філевічы Нова-Дворскай гміны. Акружыўшы з усіх бакоў вёску аб'явілі, што выходзіць забараняецца; затым схвацілі солтыса гэтай вёскі Якуба Серку, залезным ланцугом зьвязалі рукі, падагнулі да грудзей калекі і паміж рукамі і каленямі усунулі кол (чалавек зьвязаны такім парадкам ня мае магчымасьці навет павярнуцца) і пачалі біць па пятах палкамі.

— Скажы, дзе бандыты, дзе бандыта Уладзімер Брыкач жыхар вёскі Алішкаўцы?

Ня гледзечы на заяву Серкі, што аб бандытах ён нічога ня ведае, паручнік гэтага атраду адвязаўшы рэмянь ад сядла каня сам пачаў біць. Тут жа з заданьнем тых жа пытаньняў былі пабіты Алішкаўскія сяляне, якіх схвацілі на сенажаці і прыслалі ў вёску Філевічы: М. Журын, І. Май-

---

крыжам вобзямлю. Народ здзіўлены растуціўся, а пасьля стаў прывыкаць і цясьней абступіў Лявона. Песьня, арганы, цепліня і хмель нагналі на яго такі смашны сон, што ён не пачуў як разышоўся народ. А закрыстыян, дзякуючы кірмашоваму дню, таксама нанюхаўся з бутэлькі і, не абгледзіўшы касьцёлу, запёр Лявона.

Прабудзіўся Лявон а поўначы і з прасонку пачаў шукаць жонку, думаючы што ён сьпіць на лужку ў сваей хаце. Хутка ён ачухаўся і скамянеў са страху. Сярод касьцёлу гарэла лямпачка. Цішыня, дзіўныя цені, нямыя, застыўшыя хвігуры сьвятых, блеск пазалоты, ўсё гэта веяла неякім незямным, надзвычайным і наганяла жуду на Лявона. Але раскумякаўшы сабе, што ён у касьцеле, у пасьвенчаным мейсцы, пад апекай сьвятых, стаў падымацца пільна углядаючыся ў цёмныя падазрэнныя мейсцы. Не дачакаўшы нічога страшнага, пасьмялеў, кашлянуў колькі разоў для адвагі і зразу супакоіўся. Убачаўшы абраз у аўтары, дзе быў намаляваны сам Бог у ваблоках, а ў нагах меў зямлю, Лявон адазваўся:

— Дзякуй табе, Божа, што ты даў мне такі выпадак, калі я з табой магу пагутарыць вока на вока. Перш-на-перш мушу перасьцерагчы цябе, Божа, што не самавіта ты гаспадарыш на нашай старонцы. Жывем мы па справядлівасьці -як кажуць: Бога не гнявім і з людзьмі ладзім: калі нас б'юць па адной шчацэ дык падстаўляем і другую. Ніколі, нікога ня крыўдзілі, не няволілі. Аднак, гора дык як мора разліўное, ажно захлебаешся. Кінь, Божа, хоць саломінку, паратуй у бядзе, бо мы народ цёмны, дзікі, раздражнены сучасным безгалоўем і за сябе не ручаемся. Суд наш страшны і крыві мы не шкадуем. І скольки бунту у нашай душы, столькі пуду ў нагах. Памятаю, заюрыў я раз накрасьці яблыкаў у панскім садзе. А вартаўнік там быў вельмі запальчывы. Бывала птушка не уляціць у сад, каб ён не заўважыў. Сушаным гарохам страляў па нас. Вось я на[illegible]ў торбу і палез цікуючыся праз паркан. І толькі гэта пераскочыў, як чую што мяне нехта [illegible]е. Я бардзей рвануў назад і бег мусіць з [illegible] вярсты валочучы за сабой прасла паркану, што зачапілася за торбу, як я лез у сад. А то [illegible]вала...

Тут Лявон стаў гарадзіць аб сваіх няпрыстойных для сьвятога мейсца успамінах і небывалых здарэньнях і урэшце закончыў.

— Што да доўгу дык справа стаіць так: я ніколі ня кручу, а табе, моцны Божа, тым больш. Вось бачыш..

З гэтымі славамі Лявон дастаў залатую манстранцыю і ківаючы ёй казаў далей.

— Я гэтую дарагую рэч магу украсьці, але я гэтага не раблю, бо я акуратны даўжнік і сумленны чалавек і аддаю табе, Божа, доўг з барышом.

Тут ён манстранцыю паставіў ізноў на мейсцы і лічучы ўсе справы удала пакончанымі стаў разглядаць касьцёл, каб не маркоціцца пакуль расьвітае. Абходзючы каля сьцен, Лявон зглядзіў абраз сьв. Магдалены дужа падобнай да яго жонкі. Доўгі час Лявон узіраўся на абраз здзіўлены, а пасьля, зарагатаўшы на ўвесь касьцёл, сказаў:

— Ну, шмат у мяне знойдзецца гэткіх сьвятых!

Пасьля, пабачыўшы на другім абразе Адама і Эву, якія сьпіраліся аб яблыку, быў азадачаны пытаньнем: на якой гэта мове яны сьпіраюцца.

Рамы вакон, што раз ярчэй выступалі на шэрых досьвітках. Хутка забразгалі ключы каля дзьвярэй. Лявон пасьпяшыў затаіцца ў куточак. У адчынены касьцёл пачаў находзіць народ. Загудзелі званы. Арган згушчаў сьвятыя песьні. Народ маліўся за збаўленьне душы, за лепшую долю. Вышаў незаўважаным у народ Лявон, стаў на калені, шчыра памаліўся за удалыя вынікі і сунуў бардзэй да хаты.

Яшчэ з далёку пачуў Лявон звон малатоў у кузьні Боруха. Ішоў ён пэўнай, цьвёрдай паходкай, як чалавек з забясьпечанай будучынай, ішоў проста ў кузьню, каб абмяняць даляры.

— Памагай Бог! пажадаў Лявон, увышоўшы ў кузьню.

— Дзякую, адазваўся каваль і узяў пададзеныя новыя паперкі ў замэзганыя рукі, паварочаў іх, івышаў з кузьні на сонца—ён ніяк ня мог паверыць, каб у гэткага абадранца маглі быць даляры.

— Пссс... раптам адазваўся Борух і аддаў даляры Лявону.

— Што ты псыкаеш? зазлаваў Лявон.

— Пашкуства,—фальшывыя...

Вось бытцам хто абухом стукнуў па галаве Лявона, ажно ён хістануўся ў бакі і прысланіўся да вушака. Боль пашоў па жылах бы атрута тая. Крыўда, жаль і злосьць на сябе, на усё на сьвеце даводзілі яго да вар'яцтва. Качаючыся па зямлі, ён рваў сабе валасы, блюзьніў, праклінаў. Здавалася, што вось, вось і ён зьвіхнецца з розуму. Урэшце ўскочыў на ногі. З дзікімі, вытарашчанымі вачмі, ускалмачанымі валасамі, абкачаны ў зямлю, зубамі скрыгатаў і нема гразіў небу заціснутымі кулакамі.

На народ, які зьбегся глядзець, напаў страх; навет Борух схаваўся ў кузьню. Як бы неякім холадам павеяла, чадным паветрам хухнула, а Стэпка Люлічніха дык навет пабачыла рогі ў калматай галаве Лявона. Усім стала ясна, што паганы чорт зьмешаўся з паветрам і валтузіць душу Лявона. Мужчыны сталі разыходзіцца, бабы жагнацца ды сьплюваць, дзеці ў плач, а у Лявона павaліла пена з губ і ён стаў усяляк трызьніць на Бога і усіх сьвятых. Тут нехта параіў гукнуць на шаптуху, каб абараніць неба ад паняверы, але Лявон пякельна зарагатаў і паплёўся да хаты, паднімаючы нагамі пыл. Прышоўшы дамоў, сваім страшным выглядам напужаў усіх хатніх: жонка схавалася на печ, а дзеці з гвалтам выбеглі вонкі з хаты. Злосна вырваўшы млён ад жорнаў Лявон пачаў ім калаціць па абразох. Бразг шкла, трэск рамаў, крык гаспадыні — тварылі пякельную музыку. Як толькі Лявон сьцебануў па сьв. Антоні дык з пад абраза шухнуў на падлогу запылены пачок.

— Грошы ёсьць! Лявонка, маміны грошы! І жонка кульком-поныр'ю кінулася з печы, каб падняць запылены пачок. І калі яна разварачывала нікалаеўскія сторублеўкі і выкаціўся вядомы чырвонец, Лявон сядзеў ужо на лаве сапучы, як кавальскі мех, і аціраў то адным, то другім рукавом абліты потам твар.

Пасьля гэтага нічога надзвычайнага з Лявонам не здарылася. Заплаціў ён „даніну“ і на рэшта грошы пачаў лячыць розныя гаспадарскія недамаганьні. А крыху абжыўшыся раз'еўся, пачырванеў, а гутарку сваю пераплетаў вясёлым сьмехам не падазраючы таго, што на тым сьвеце яму нешчаснаму прыдзецца цяжка адпакутаваць.

Лявон Жыцень.

◆◆◆◆

ка, І. Брыкач, А. Босько і А Брыкач, апошні кульгавы стары, гадоў пад 60 быў пабіты да страты прытомнасьці. Тады ў М. Серкі узялі рыдлёўку і пачалі капаць яму, маючы надзею закапаць яго, каб зямля адцягнула, але А. Брыкач прышоў да сябе і капаць яму кінулі. Тут жа былі пабіты два сялянiны з вёскі Крыпічоўшчына Мікалай і Кастусь Альховічы. Сюды быў вытрабаваны і пабіты солтыс вёс. Карпачоўцы Міхал Гіль. Усіх зьбітых, акрамя солтысаў, на хурманках павезьлі яшчэ ў Н. Двор, але дзеля таго, што пабітыя самі не маглі узлезьці на вазы, дык прыказалі селяніну Сьцяпану Серка, ў гумне якога адбывалася такое шуканьне бандытаў, пасадзіць іх на вазы. У гэтай-жа вёсцы пабілі старога Янку Серку, якому 70 гадоў, каторы не адамкнуў каморы, дзеля таго, што ад страху ня помніў дзе падзеў ключ. У яго ж забралі выраблeную шкуру каровы, высыпалі з кадушкі 50 яек і патаптaлі нагамі. Вытрабаваны быў у м. Н.-Двор і «падкован» палкамі па пятках Александар Захарэвіч, Неўзабаве было прыказана зьнесьці з вёскі 20 п. жыта, 2 пуды сала, 500 яек. Вага і жыта прымалася на вока, вядома у зьменшаным ліку. На 23 ліпеня прыказалі прывезьці у Н. Двор 5 вазоў сена, 10 бараноў і 15 ф. масла. Быў адпраўлены памянены лік сена і масла, а авечак дзевяць. На 16 ліпеня прыказана і адпраўлена: 2 вазы сена, адзін пуд бульбы, адзін баран, 18 ф. сала, 15 ф. масла. 19 ліпеня: два вазы сена. За ўсё гэта 23 ліпеня было заплачана пяць тысячаў марак. 28 ліпеня зноў узялі адзін воз сена. 1-га жніўня: 3 п. жыта, 3 п. бульбы, 17 пуд. саломы — ўсе гэта дарэмна. 21 ліпеня застрэлілі у Янкі Хурса з вінтоўкі парсюка вагаю каля 4 пуд., а заплацілі яму ўсяго 14.000 мар., у Аляксандра Захарэвіча так сама без грошаў узялі два вазы сена. Такія-ж рэквізыцыі адбыліся і па другіх весках.

м. Іля Вялейскага павету.

У нашым мястэчку цяпер кожнае лета, як з'езджаецца вучашчаяся моладзь, ставяць беларускія спэктаклі. Ставілі-б і зімой, бо тутэйшыя жыхары заўсёды горача вітаюць роднае мастацтва, але няма памешканьня. Есьць тут адзін велізарны ток, які летам ачышчаецца ад збожжа і служыць за тэатр. 16-га ліпня дзякуючы захадам Нарко У. і Кажуро П. адбыўся спэктакль. Ставілі: „Зьбянтэжаны Саўка". і Заручаны Паўлінкі". Пасьля прадстаўленьня прапяеў хор беларускі гымн пад кіраўніцтвам Нарко.

На днях у нас заклаўся беларускі выбарны камітэт. Сяляне зацікаўлены выбарамі і здаволены, што беларусы выстаўляюць свае сьпіскі.

С.

Беніца, Ашмянскага пав.

Зноў зьдзек, зноў глум. Не пасьпея чалавек супакоіцца ад трывогі, як на табе, навая бяда. У нашай гміне было 11 беларускіх школак, якія былі адчыняны стараньнем і хлапотамі месных жыхароў. Радаваліся мы, што нашы дзеткі могуць вучыцца ў сваей роднай мове. Але, як відаць, наша радасьць была косьцяй ў горле некаторым панкам, якія 27. VIII г. г. на паседжаньні гміннай школьнай Рады вынясьлі пастанову зачыніць усе беларускія школы, а замест іх адчыніць польскія. Выносьця паночкі, якія хочаце пастановы, але і мы паставім на сваём. Мы нойдзем справядлівасьць калі не ў Ашмяне і Вільні, дык трапім і ў Варшаву. Але гэты выпадак лішні раз нам паказывае, што да тых часоў, покуль у Сойме ня будзе нашых беларускіх дэпутатаў — ня будзе нас каму бараніць. Толькі дэпутаты, якіх выставіць Б. Ц. В. К. будуць праўдзівымі абаронцамі нашага беларускага працоўнага сялянства. Толькі яны сьмела і голасна закрычаць аб той крыўдзе і гвалтах, якія пад намі беларусамі робяцца.

Выбаршчык.

Беларускае Жыцьцё.

Беларуская гімназія ў Навагрудку. Прыватная Гімназія ў Навагрaдку атрымала канцэсію на школьны 1922—23 г. дзякуючы захадам свайго кіраўніка беларускага дзеяча А. Даніевіча.

Цяпер Гімназія будзе складацца з трох клясаў першых беларускіх і пяцёх вышэйшых расейскіх.

На утрыманьне беларускіх клясаў закладваецца Таварыства Сярэдняй Школы ў Навагрудку, але яно яшчэ не зацьверджано уладай.

Кіраўніком клясаў беларускіх будзе Цэханоўскі, а расейскіх Скрэбец.

Навaградчанін.

Радашкоўская 8-мі клясов. Беларуская Гімназія імяні Скарыны адчыніла запісь вучняў. Ахвотня запісываецца моладзь з прылегаючых месцовасьцяў. Дырэктарам выбраны Аляксандр Вярнікоўскі, які кончыў духоўную акадэмію і мае даўгалетнюю пэдагагічную практыку. Ня гледзючы на перашкоды, якія рабіла Вялейскае Стараства, гімназія атрымала канцэсію, дзякую шчырым стараньням Ал. Уласава і Радашкоўскага т-ва Белар. Школы. У будучыне м. Радашкавічы абяцуець стацца моцным беларускім культурным цэнтрам.

Беларускі клюб у Радашкавічах. Тутэйшыя беларусы робяць захады перад уладай ас адчынсньні Беларускага клюбу.

Змаганьне за беларускую школу. У мястэчыу Гарадок, Вялейскага павету, школьны Куратар дазволіў адчыніць 7-мі клясовую беларускую школу, але школьны інспэктар і гмінная рада робяць ўсялякія перашкоды. Так два дамы, дзе былі раней школы, аддадзены пад памешканьне прыватных асобаў, і кузьню, каб толькі не аддаць пад беларускую школу.

N

Новая пьеса. Драматург Фр. Аляхновіч напісаў новую пьесу ў 3-х актах з сучаснага жыцьця пад наз. „Пан міністар". Пьеса гэтая будзе пастаўлена Беларускай Драматычнай Майстроўняй.

Антон Грыневіч прыгатаваў да друку падручнік па пяяньню „Навука сьпеву" і злажыў „Школьны сьпеўнік", які складаецца з 80 народных песьнь.

Арышты беларусаў. Не кажучы ужо аб беспадстаўных масавых арыштах сялян-беларусаў, цяпер у час выбарнай кампаніі, што раз часьцей даходзяць чуткі аб арыштах сярод беларускай інтэлігенцыі. На днях арыштавалі ў Горадні студэнта Віленскага Унівэрсытэту Грынкевіча.

Беларуская вечарына. Пасьля сямімесячнага перарыву ў м. Докшыцах мяйсцовай моладзёжай 2 ліпня г. г. быў згуляны спэктакль. Ставілі: „У Кавалёвай хаце" „Міхалка" і „Збянтэжаны Саўка". П'есы былі добра згуляна, але памешканьне тэатру ня стаўпіла ўсяго народу і не дало магчымасьці жадаючым пабыць на беларускім спэктаклю.

Бачучы такое шчырае жаданьне жыхароў места да беларускага тэатру, моладзь наша згуртаралася і ў большым памяшчэньні ў нядзелю 20 жніўня г. г. зрабілі спэктакль - вечар. Ставілі: „На вёсцы" „Модны шляхцюк" і „Чорт і баба". Ролі выпаўняны надта добра. Публіцы асабліва падабаліся песьні, спеваныя пад кіраўніцтвам п. Дзевалтоўскага Антося.

Надта шкада, што ў нас няка чалавека, каторы здалеў бы падгатаваць да выбараў у Сойм, у той час, калі насяленьня робіцца балей-меней сьвядомым і калі некатарыя ня сьпяць і робяць сваё дзело. Як, прыкладам, у нядзелю 27 жніўня заложана „Koło Polskie Kresów Wschodnich".

К. Ш.

Сярод беларусаў матурыстаў. У Беларускую Цантр. Школьн. Раду апошнімі часамі прыбываюць беларусы матурысты з ўсіх бакоў Заход. Беларусі, якія дамагаюцца стыпэндыяў у Пражскі унівэрсытэт і Палітэхніку. На жаль шмат жадаючых не атрымала стыпэндыяў з прычыны агранічанага іх ліку.

Весткі з Горадні.

Беларускае Т-ва помачы ахвярам вайны ладзіць беларускую вечарыну на 22 верасьня. Пастаўлена будзе: «Страхі жыцьця» драма ў 3-х актах Ф. Аляхновіча і канцэртны аддзел.

Гэтае Т-ва 10-IX арганізуе збор па горадзе на карысьць дзяцей Беларускага прытулку ў Горадні.

Белар. Цантр. Выбарны К-т склікае на 10 і 16 г. м. мітынгі ў справах выбараў у Сойм.

Што чуваць у сьвеці.

Францыя гатуецца да вайны.

З прычыны ня выплаты грошаў немцамі для Францыі, апошняя пагражае вайной Нямеччыне. Як паведамляе газ. „N-J. H." францускім урадам аддадзены загад войску быць на пагатове да выступленьня.

Аўстрыйскае пытаньне ў Лігі-Нацый.

Пытаньне аб катастрафічным палажэньні Аўстры будзе разгледацца ў Лігі Нацый.

Павышэньне паштовай аплаты.

Павышэньне паштовай аплаты ў Польшчы павялічана ў паўтары разоў (150 %).

Абецанкі.

Польскі міністар справядлівасьці заявіў прадстаўніку газ. „Robotnik", што усялякія беспраўнасьці павыбарных справах з боку адмістрацыі будуць самым энэргічным спосабам прасьледавацца.

Антанта разваліваецца.

З Лёндану паведамляюць, што Л. Джордж вынес пастанову апавясьціць фармальнае выступленьне Англіі з Антанты, калі Францыя самачынна выступіць проціў Нямеччыны.

(„Р. К.").

Грэцкі фронт прарвалі туркі.

Газэты паведамляюць, што туркі ў трох месцах прарвалі грэцкі фрон. Грэцкае войска ў паніцы адступае. Есьць дагадкі, што грэкі пакінуць Малую Азію.

Граніца замацавана.

На пленарным паседжаньні мешанай пагранічнай камісіі аканчальна урэгулявана пытаньне аб правядзеньне граніцы паміж Польшчай і Сав. Расеяй.

Забастаўка паштавікоў ў Варшаве.

6-га верасьня ўсе паштовыя працаўнікі аб'явілі забастоўку. Пошту вартуець паліцыя.

Паштовая скрынка.

Прага. І. Д. Вашыя вершы атрымалі. Дзякуем. Успомніце словы М. Багдановіча: „Трэба з сталі каваць, гартаваць, гібкі верш, абрабляць яго трэба з цярпеньнем."

Дзісна Явку. Прабуйце лепш пісаць апавяданьні. Пішыце, што ў вас чуваць.

Паведамленьне.

Даводзіцца да ведама прыездных з правінцыі вучаніц і вучняў І Віленск. Белар. Гімназіі ніжэй паданае:

Камітэт Беларускага Таварыства Помачы пацярпеўшым ад вайны на аснове § 9 л. 7 свайго Статуту і пастановы ад 7. II. 22 г. адчыняе ў гэтым годзе два інтэрнаты — асобна для вучняў і вучаніц, пад даглядам вызначаных на гэта Камітэтам кіраўніка і кіраўніцы.

Бацькі, якія хацелі-б зьмесьціць сваіх дзяцей ў інтэрнатах альбо самі вучні-аніцы, падаюць аб гэтым заявы ў Камітэт;

Варункі, на якіх вучні-аніцы могуць быць прыняты ў інтэрнат, гэткія: Дзеці павінны мець сваю падушку, коўдру, дзьве пасьцілкі і сяньнік (ложкі даець Камітэт), тры пары бялізны, патрэбную вопратку і для агульнага катла свае харчы: на I палову школьнага году па гэткім разьлічэньню **хлебнай мукі 5 пуд., пшанічнай мукі 5 хунт. круп 1 п.** (пры гэтым 1 хунт круп можа быць заменены 1½ хунт. гароху або фасолі), бульбы 5 пўд. (або адразу 10 пуд. на ўвесь школьны год), **сала або кар, масла 16 хунт., алею 8 хунт., буракоў 20 хунт. цыбулі 3 хунт., грыбоў 1 хунт.** і грашмі на апал, сьвятло і службу 18.000 мар. польск. Харчы могуць быць заменены на I паўгодзьдзе грашмі па істнуючых на іх ценах у Вільні ў часе выплаты.

Далейшая норма харчоў будзе залежаць ад сапраўднага расходу іх ў I паўгодзьдзі.

УВАГА: Выдаткі на харчаваньне могуць значна зьменшыцца, калі удасцца дастаць дапамогу на інтэрнат ад „Грамадзянскай Апекі," як на звычайную вучнёўскую бурсу, на што Камітэт мае сталую надзею.

Старшыня Камітэту. Сымон Рак-Міхайлоўскі.

Рэдактар-Выдавец Ф. АЛЯХНОВІЧ. Друкарня „ДРУК" Субач, 2.